**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**

**Дзяржаўная навуковая ўстанова**

**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**

УДК [272 (476) (091) + 947.6] "1772/1830"

ГАНЧАРУК Ігар Генадзьевіч

# КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ НА БЕЛАРУСІ Ў СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ. 1772 – 1830 гг.

07.00.02 – айчынная гісторыя

**Аўтарэферат дысертацыі**

на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Мінск – 2005

Праца выканана ў ДНУ
«Інстытут гісторыі НАН Беларусі»

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, дацэнт
Сяльверстава Святлана Яўгенаўна,
УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт
імя Янкі Купалы», кафедра гісторыі Беларусі

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук
Галенчанка Георгій Якаўлевіч, ДНУ
«Інстытут гісторыі НАН Беларусі»,
аддзел спецыяльных гістарычных навук

кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Сосна Уладзімір Аркадзьевіч,
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы,
кафедра гісторыі і беларусазнаўства

Апаніруючая арганізацыя – УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт
культуры»

Абарона адбудзецца «18» люцага 2005 г. а 16 гадзіне на пасяджэнні Савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара навук у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэлефон вучонага сакратара – 284-18-39)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы
імя Якуба Коласа ( г. Мінск, вул. Сурганава, 15)

Аўтарэферат разасланы «13» студзеня 2005 г.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.В. Яноўская



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** З канца 80-х гадоў XX ст. на Беларусі назіраецца адраджэнне і актывізацыя рэлігійнага жыцця. З абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь гэты працэс паскорыўся. У рэспубліцы адбываецца рост колькасці каталіцкіх парафій, дзейнічаюць дэканаты, вядзецца падрыхтоўка будучых святароў у духоўных семінарыях. Актывізацыя дзейнасці каталіцкага касцёла абудзіла грамадскі і навуковы інтарэс да яго гісторыі.

Становішча касцёла на беларускіх землях у часы Расійскай імперыі не было прадметам спецыяльнага даследавання беларускіх гісторыкаў. Між тым, гэта якасна новы этап у яго гісторыі, які характарызуецца стратай ім прывілеяванага становішча і прыстасаваннем да дзейнасці ў новых палітычных умовах. На працягу 1772-1830 гг. была распрацавана прававая база функцыянавання касцёла ў адпаведнасці з расійскім заканадаўствам, адбыліся кардынальныя змены ў яго арганізацыйнай структуры, працягвалася living разнабаковая дзейнасць каталіцкага духавенства. Вывучэнне дадзенага перыяду ў гісторыі адной з найбуйнейшых канфесій Беларусі важна для высвятлення генезісу спецыфічных рыс, якія сёння адрозніваюць каталіцтва на нашых землях. Акрамя таго, даследаванне гэтай праблемы дае ключ да разумення шмат якіх сацыяльных працэсаў, якія адбываліся ў той час і дазваляе рэканструяваць цэласную карціну палітычнага жыцця на беларускіх землях.

Многія аспекты тэмы маюць непасрэдную сувязь з сучасным становішчам касцёла. Гэта тычыцца такіх падзей і з'яў у жыцці касцёла, як аднаўленне дзейнасці дыяцэзіяльных структур, у прыватнасці Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі (1991 г.), наданне кардынальскай годнасці арцыбіскупу К.Свёнтку (1994 г.), павелічэнне колькасці парафій, развіццё пэўных форм рэлігійнасці і пастырства.

Нераспрацаванасць ці дробнасць асвятлення ў беларускай гістарыяграфіі розных аспектаў становішча касцёла ў даследуемы перыяд патрабуе спецыяльнага разгляду гэтай тэмы. Гэта тым больш важна, што асобныя яе пытанні закраналіся ў працах расійскіх і польскіх даследчыкаў, якія падыходзілі да іх з уласных, часцей за ўсё, супрацьлеглых пазіцый. Беларускім гісторыкам, якія сёння актыўна працуюць над канфесіянальнай праблематыкай, неабходна выпрацаваць уласны погляд на падзеі і працэсы, якія адбываліся ў даследуемай галіне жыцця грамадства.

Вывучэнне ролі і месца касцёла ў грамадскім жыцці беларускіх зямель дае матэрыял для шырокага паралельнага аналізу з сучасным становішчам касцёла, фарміруе грамадзянскую пазіцыю каталіцкіх вернікаў і тым самым спрыяе стабільнасці ў грамадстве. Распрацоўка адэкватнай канфесіянальнай палітыкі немагчыма без ацэнкі гістарычнага шляху і традыцый, якія маюць канфесіі на беларускіх землях. Вывучэнне таго, як адрэагаваў касцёл на змены

ў палітычнай сітуацыі і якую трансфармацыю дазналі яго інстытуты ў даследуемы перыяд, можа дапамагчы лепшаму разуменню сучаснага становішча гэтай канфесіі і такім чынам спрыяць абранню канфесіянальнай палітыкі, найбольш адпаведнай дэмакратычным памкненням нашай дзяржавы.

**Храналагічныя і геаграфічныя межы даследавання.** Храналагічныя рамкі дысертацыйнай працы ахопліваюць перыяд 1772-1830 гг. Першы падзел Рэчы Паспалітай, дата якога ўзята за ніжэйшую храналагічную мяжу даследавання, звеставаў пачатак карэнных змен у статусе каталіцкага касцёла, які павінен быў прыстасоўвацца да ролі “цярпімай” канфесіі і адпаведна трансфарміраваць касцёльныя інстытуты. Гэтая дата таксама паклала пачатак фарміраванню новага накірунку ў канфесіянальнай палітыцы Расійскай імперыі, упершыню атрымаўшай у свае межы мільёны падданых-католікоў. У якасці верхняй рамкі даследавання абраны пачатак 1830-х гадоў. Ужо ў другой палове 1820-х гадоў у канфесіянальнай палітыцы царскага ўрада пазначылася змена пазіцый ў адносінах да каталіцкага касцёла. У час паўстання 1830-1831 гг. і пасля яго новыя тэндэнцыі перараслі ў рэпрэсіўны курс, які змяніў палітычную сітуацыю на беларускіх землях, у тым ліку, і ўмовы, у якіх дзейнічаў каталіцкі касцёл. Пяцідзесяцігоддзе, якое ляжыць паміж абранымі храналагічнымі рамкамі, было пазначана кардынальнымі зменамі ва ўсіх галінах жыцця беларускіх зямель. Працэс мадэрнізацыі грамадства, які пачаў развівацца ў гэты час, вызначыўся ў эканоміцы, сацыяльнай сферы, знайшоў адбітак у культуры. Для каталіцкага касцёла на беларускіх землях дадзенае пяцідзесяцігоддзе было асобным перыядам. Прыстасоўваючыся да новых палітычных і сацыяльных абставін, ён трансфарміраваў свае інстытуты і формы дзейнасці. З іншага боку, змены адбываюцца ў стасунках паміж касцёлам і дзяржавай. Менавіта ў гэты час былі сфарміраваны заканадаўчыя асновы прававога становішча касцёла, якія ў галоўных рысах захоўваліся да 1917 г.

Геаграфічна даследаванне ахоплівае тэрыторыю ў адміністрацыйных межах Рэспублікі Беларусь. Гэта тлумачыцца тым, што на беларуска-літоўскім памежжы, у межах сучаснай Літвы, існавала такая шчыльная парафіяльная сетка, што практычна немагчыма вылучыць парафіі па этнічнай прыкмеце. Разгляд жа становішча касцёла на тэрыторыі ўсёй Віленскай дыяцэзіі сказіў бы агульную карціну ў дачыненні да беларускіх зямель.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыя з’яўлялася часткай навуковай праграмы Інстытута гісторыі НАН Беларусі “Духоўнае грамадства і палітычнае жыццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)”. Тэрмін выканання : 1992 – 1996 гг.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай даследавання з’яўляецца аналіз становішча рымска-каталіцкага касцёла на тэрыторыі Беларусі ў 1772-1830 гг., выяўленне яго спецыфікі і ролі ў грамадстве. У сувязі з гэтым вызначаны наступныя задачы:



- паказаць фарміраванне заканадаўчай базы ў адносінах да касцёла і вылучыць асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін з ім самадзяржаўнай улады;
- прааналізаваць арганізацыйную структуру касцёла на беларускіх землях (дыяцэзіяльную і ордэнскую), выявіць яе асаблівасці;
- выявіць ролю каталіцкага касцёла ў развіцці адукацыі на беларускіх землях і арганізацыі духоўных і публічных навучальных устаноў;
- вылучыць асноўныя формы пастырскай дзейнасці духавенства;
- паказаць дзейнасць духавенства ў сферы дабрачыннасці і ў грамадска-палітычным жыцці краіны.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** Аб’ектам даследавання з’яўляецца грамадскае жыццё беларускіх зямель у 1772 – 1830 гг. Прадметам – рымска-каталіцкі касцёл, як адзін з інстытутаў грамадскага жыцця. У прыватнасці, у дадзенай працы разглядаюцца перамены, якія закранулі статус рымска-каталіцкага касцёла і яго арганізацыйную структуру, а таксама асноўныя напрамкі дзейнасці духавенства ў новых палітычных умовах.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Аснову метадалогіі даследуемай тэмы склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. У дысертацыі выкарыстаны агульнанавуковыя і гістарычныя метады даследавання. Сярод іх стандартныя логіка-тэарытычныя працэдуры, такія як: апісанне, абагульненне, аналіз, сінтэз,індукцыя, дэдукцыя, класіфікацыя і інш. Галоўнымі гістарычнымі метадамі працы сталі: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны. Істотную ролю ў дысертацыі адыграў метад колькаснага аналізу (матэматычна-статыстычная апрацоўка дадзеных архіўных крыніц і навуковай літаратуры). Высновы рабіліся на аснове параўнальнага аналізу гістарычных фактаў і з’яў.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дадзеная праца з’яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі спецыяльным навуковым даследаваннем, у якім аналізуецца прававое становішча рымска-каталіцкага касцёла і асноўныя напрамкі дзейнасці духавенства на беларускіх землях у 1772-1830 гг. У працы вызначаны асноўныя мерапрыемствы ў фарміраванні заканадаўчай базы каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі. Упершыню асвятляецца пастырская дзейнасць духавенства. У навуковы ўжытак уводзяцца статыстычныя апрацаванні, якія тычацца колькасці каталіцкіх парафій і кляштараў паводле ордэнскіх груп, навіцыятаў і манаскіх студый. Прадпрынята спроба навуковай ацэнкі беларускай і замежнай гістарыяграфіі па тэме даследавання. Дысертацыя ўводзіць у навуковы зварот неапублікаваныя архіўныя дакументы і шырокае кола друкаваных крыніц.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і высновы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны для далейшага, больш паглыбленага вывучэння асобных аспектаў тэмы і служыць асновай для вывучэння наступных перыядаў гісторыі касцёла. Іх можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы спецыяльных і лекцыйных курсаў, папулярызацыі гістарычных ведаў у сродках масавай інфармацыі, у

краязнаўчай працы. Атрыманыя вынікі ўведзены ў тэматыка-экспазіцыйны план Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі і выкарыстоўваюцца падчас навукова-асветніцкай працы музея. Яны таксама могуць быць карыснымі для вырашэння сучасных канфесійных праблем.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Юрыдычны статус каталіцкага касцёла разглядаўся царскімі ўладамі ў сувязі з пытаннем замацавання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Яго распрацоўка адбывалася ў адпаведнасці з прынцыпам прымата дзяржавы над царквой і ў галоўных рысах была завершана да 1825 г. Новая заканадаўчая база не толькі змяняла папярэдні статус касцёла на беларускіх землях, але таксама супярэчыла яго традыцыям і канонам. Аднак прыняты ў імперыі прынцып адносін дзяржавы і царквы ў стасунку да касцёла не прывёў у даследуемы перыяд да жаданых вынікаў.

2. Прынцып адміністрацыйнага падпарадкавання касцёла расійскаму дзяржаўнаму апарату рэалізоўваўся, між іншым, ў новым дыяцэзіяльным падзеле. Царскія ўлады не прызналі існаваўшую на беларускіх землях на працягу стагоддзяў дыяцэзіяльную структуру і правялі яе рэарганізацыю ў адпаведнасці з новым адміністрацыйным падзелам. Адбылося драбненне дыяцэзіяльных структур. Аб'ектыўна гэта прывяло да выніку, які не быў мэтай царскай адміністрацыі – да ўзмацнення мясцовай сеткі парафій і дэканатаў.

3. Змены ў прававым становішчы каталіцкіх манаскіх ордэнаў на беларускіх землях у даследуемы перыяд адбыліся галоўным чынам у адміністрацыйнай сферы. Кляштары захавалі магчымасць дзейнічаць у адпаведнасці з ордэнскімі правіламі, іх агульная колькасць заставалася стабільнай. Выгнанне езуітаў не паўплывала на пазіцыю расійскіх улад у адносінах да іншых манаскіх ордэнаў.

4. Каталіцкі касцёл захаваў сістэму сваіх навучальных устаноў – духоўных і публічных. Школы для духавенства з'яўляліся часткай адукацыйнай прасторы на беларускіх землях. Духавенства працягвала адыгрываць вядучую ролю ў развіцці сярэдняй і пачатковай адукацыі на беларускіх землях. Такое становішча тлумачылася шэрагам абставін. Каталіцкае духавенства мела высокі інтэлектуальны патэнцыял. Сістэма яго падрыхтоўкі захавала пераемнасць з часоў Рэчы Паспалітай. Школы пры навіцыятах, студыі, полацкая Акадэмія і духоўныя семінарыі давалі высокаадукаваных выкладчыкаў. Гэта павышала аўтарытэт публічных школ, якімі апекавалася каталіцкае духавенства. Захаванню прыярытэта касцёла ў адукацыі спрыяла кансерватыўная пастава царскіх улад у дачыненні да асветніцтва ў даследуемы перыяд. Апрача таго, сістэму касцёльных навучальных устаноў падтрымлівала мясцовая шляхта.

5. У штодзённым рэлігійным жыцці каталіцкае духавенства ажыццяўляла шматлікія віды пастырскай працы. Развіццё разнастайных форм рэлігійнай практыкі, якое пазначылася ў папярэдні перыяд, не было спынена. Знаходжанне ў новай дзяржаве не паўплывала адмоўна на гэты бок дзейнасці касцёла. Царскія ўлады не ўмешваліся ў сферу рэлігійнага культу, прытрымліваючыся ўзятых на сябе ў гэтай галіне абавязацельстваў.

6. Каталіцкі касцёл імкнуўся да актыўнай паставы ў грамадскіх справах, захоўваючы адначасова лаяльнасць да царскіх улад. Працягваючы займацца дабрачыннасцю ў межах касцёльных інстытутаў, духавенства актыўна ўключылася ў дзейнасць свецкіх дабрачынных арганізацый, у першую чаргу, у сферы сацыяльнай дапамогі бяднейшым слаям насельніцтва. Удзел у грамадска-палітычным жыцці праявіўся галоўным чынам у антыўрадавых акцыях, якія ажыццяўляліся асобнымі прадстаўнікамі духавенства па асабістай ініцыятыве, пры гэтым яны выступалі не ад імя каталіцкага касцёла, а як прыватныя асобы.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Даследаванне з'яўляецца самастойнай аўтарскай працай. Дысертантам выяўлены, сістэматызаваны і прааналізаваны абшырны фактычны матэрыял з архіваў і бібліятэк Беларусі, Польшчы і Расіі. Крытычна асэнсаваны навуковыя працы айчынных і замежных даследчыкаў. Прааналізаваны комплекс матэрыялаў дазволіў выявіць змены ў інстытуцыянальнай пабудове рымска-каталіцкага касцёла, выкліканыя новай палітычнай сітуацыяй пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прасочана дынаміка парафіяльных і ордэнскіх структур на працягу даследуемага перыяду ў межах сучаснай Рэспублікі Беларусь.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы і вынікі праведзенага даследавання сталі базай для дакладаў і паведамленняў на міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і кангрэсах : Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі" (Гродна, 1992); II Міжнародным кангрэсе беларусістаў "Беларусь паміж Усходам і Захадам" (Мінск, 1995); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі. ХШ –ХХ ст." (Гродна, 1996); Міжнародным хрысціянскім кангрэсе "Хрысціянства ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе і яго адносіны з Усходам і Захадам" (Люблін, 1996); рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годдзю горада Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея ім. І.І. Стаброўскага "Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў" (Слонім, 1999).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя вынікі даследавання апублікаваны ў 15 навуковых артыкулах, у тым ліку 2 – у навуковых часопісах, 3 – у навуковых зборніках, 4 – у матэрыялах канферэнцый, 6 – у энцыклапедычных артыкулах. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 99 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з тэрміналагічнага слоўніка, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, 5 глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 136 старонак. У тым ліку спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры (345 адзінак) – 20 стар., дадаткі (13 адзінак) - 11 стар.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першай главе "Гістарыяграфія і крыніцы" даецца агляд гістарыяграфіі праблемы і аналізуецца стан апублікаваных і архіўных крыніц па тэме даследавання. Глава складаецца з двух параграфаў.У першым параграфе першай главы "Агляд гістарыяграфіі" вызначаны ўзровень распрацоўкі праблематыкі даследавання, якое патрабуе разгляду ў шырокім спектры пытанняў.

Прававое становішча касцёла, яго арганізацыйныя структуры і дзейнасць духавенства знаходзіліся ў непасрэднай сувязі з палітыкай, якую праводзіў царскі ўрад. Пытанні дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне не толькі ў беларускай гістарыяграфіі, але таксама ў расійскай і польскай.

У дарэвалюцыйнай Расіі каталіцтва лічылася замежным веравызнаннем. Яго даследаванне, як заўважае Л.Е.Гарызонтаў, перапляталася з пытаннем канфесіянальнай і нацыянальнай палітыкі самадзяржаўя. Першыя працы, у якіх закраналіся розныя аспекты дзейнасці касцёла ў Расійскай імперыі, з'явіліся ў другой палове XIX ст., калі царская палітыка ўжо мела выразна акрэслены курс на абмежаванне ўплываў каталіцкага касцёла. Гэта былі работы, напісаныя з афіцыйна-манархічных пазіцый, у якіх становішча касцёла разглядалася ў сувязі з унутранай і знешняй палітыкай царскіх улад. Аўтары (Д.Талстой, М.Сакалоў і інш.) бачылі ў касцёле перашкоду русіфікацыі беларускіх зямель і ўхвалялі ўрадавыя мерапрыемствы ў дачыненні да яго. Аб'ектам асаблівай увагі даследчыкаў было пытанне захавання і выгнання ордэна езуітаў з Расійскай імперыі. Ю.Самарын, М.Марошкін, А.Папоў, А.Сапуноў звязвалі гэта пытанне з палітычнымі мэтамі царызму, аднак, на іх думку, пастаўленыя пры гэтым задачы не былі дасягнуты.

Сярод паслярэвалюцыйных даследчыкаў вылучаецца І.К.Смоліч, які даследаваў касцёл праз прызму адносін да яго царскага ўрада і праваслаўнай царквы ў перыяд з канца XVII ст. - да 1917 г. Вызначыўшы тэндэнцыі развіцця каталіцкага касцёла, аўтар звярнуў увагу на спрыяльныя ўмовы, якія склаліся для яго ў часы Кацярыны ІІ, Паўла І і Аляксандра І. Расійская традыцыя даследавання дзейнасці ордэна езуітаў была працягнута ў працах У.Лушпая, С.Якавенкі і іншых аўтараў, якія разглядалі пытанне ў кантэксце ўзаемаадносін езуітаў з папам.

У беларускай савецкай гістарыяграфіі не існавала канфесіянальнай гісторыі, як асобнай галіны гістарычных ведаў. Сярод нешматлікіх прац, прысвечаных каталіцкаму касцёлу, вылучаліся работы Я.Н. Мараша, які даследаваў эканамічнае становішча касцёла і формы дзейнасці духавенства ў Віленскай дыяцэзіі ў XVI-XVIII ст. Аўтар паказаў, што на працягу дадзенага перыяду адбыўся рост зямельнай уласнасці касцёла, павялічылася колькасць парафій і кляштараў.



Пачынаючы з 1990-х гадоў у беларускай гістарыяграфіі павялічылася колькасць даследаванняў, прысвечаных каталіцкаму касцёлу. Прадметам аналізу былі некаторыя аспекты становішча касцёла ў 1772-1830 гг. у сувязі з царскай палітыкай, сацыяльна-эканамічным і культурным развіццём беларускіх зямель (С.І.Таляронак, М.У.Смяховіч, Я.К.Анішчанка, У.А.Сосна).

У апошняе дзесяцігоддзе зроблена спроба пераасэнсавання дзейнасці ордэна езуітаў (А.Жлутка, Т.Б.Блінова). Сярод персаналіяў увагу даследчыкаў прыцягнулі асобы мітрапаліта С.Сестранцэвіча і прэлата С.Шантыра (А.Л.Кіштымаў, А.М.Філатава, Н.Каленік). Акрамя таго, былі разгледжаны асноўныя накірункі канфесіянальнай палітыкі царскага ўрада ў 1772-1860 гг. (А.М.Філатава), а таксама акалічнасці пераводу уніятаў у праваслаўе і лацінскі абрад (А.М.Філатава, С.В.Марозава, У.А.Сосна). Становішча каталіцкага касцёла знайшло адлюстраванне ў калектыўнай працы "Канфесіі на Беларусі", у якой, у прыватнасці, аналізуецца канфесіянальная палітыка царскага ўрада і некаторыя формы дзейнасці каталіцкага духавенства. С.Я.Куль-Сяльверстава, якая даследавала фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях у другой палове XVIII ст. - 1820-х гадах, спецыяльна вылучыла каталіцкае духавенства і звярнула ўвагу на то, што нягледзячы на працэс секулярызацыі, які адбываўся ў розных сферах навукі і культуры, мясцовая спецыфіка і палітычная сітуацыя спрыялі захаванню ўплываў касцёла. С.Марозава надала ўвагу распрацоўцы канфесіянальнай гістарыяграфіі айчыннай гісторыі.

Найбольш значная па тэме дысертацыі польская гістарыяграфія, у якой разглядаецца становішча касцёла на гістарычных землях Рэчы Паспалітай. Сучасны беларускі фактар у польскіх працах, як правіла, не ўлічваецца. Тэрмін "Беларусь" лакалізуецца ў дачыненні да пэўнай тэрыторыі – зямель, якія пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай адышлі ў склад Расіі і на якіх Кацярына ІІ арганізавала Беларускую дыяцэзію. У польскіх працах становішча і дзейнасць касцёла аналізуецца ў розных напрамках – палітычным, грамадскім, адміністрацыйна-тэрытарыяльным. Аўтары даследуюць формы пастырскай і пазакасцёльнай (адукацыйна-выхаваўчай, дабрачыннай, грамадскай) дзейнасці духавенства, распаўсюджанасць пэўных культаў, спецыфіку манаскіх ордэнаў, рэлігійнасць мас і іншыя пытанні.

З гістарыяграфічных распрацовак найважнейшай застаецца праца Т.Крахеля, якая прысвечана гістарыяграфіі Віленскай архідыяцэзіі. У галіне крыніцазнаўства аўтар звярнуў увагу на значэнне, якое маюць ў даследаванні касцёла схематызмы – штогадовыя спісы дыяцэзіяльных структур і духавенства.

Найбольш падрабязна польскімі даследчыкамі паказана адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура касцёла, яго прававое становішча і канфесіянальная палітыка царскага ўрада. Вылучаюцца працы Б.Кумара, С.Літака, П.Гаха, якія ўтрымліваюць багаты фактаграфічны і статыстычны матэрыялы аб дыяцэзіяльным і ордэнскім духавенстве. Абагульняючай працай, у якой былі ўлічаны ўсе папярэднія даследаванні, з'яўляецца юбілейны зборнік, падрыхтаваны калектывам аўтараў да 600-годдзя

Віленскай архідыяцэзіі. Значны прабел у даследаванні гісторыі Мінскай дыяцэзіі быў ліквідаваны выданнем у 1998 г. рукапіса Яна Барэйкі Ходзькі, у якім разглядаюцца дыцэзіяльныя і ордэнскія структуры дыяцэзіі каля 1830 г.

Працы польскіх гісторыкаў патрабуюць крытычнага падыходу, аб'ектам іх даследаванняў з'яўляюцца праявы польскіх уплываў на гістарычных землях Рэчы Паспалітай. Землі сучаснай Беларусі не вылучаюцца ў якасці самастойнага даследавання.

Агляд гістарыяграфіі па тэме дысертацыі дазваляе зрабіць наступныя высновы: асобныя пытанні, якія тычыліся становішча каталіцкага касцёла ў разглядаемы перыяд даследаваліся ў расійскай дасавецкай, савецкай, постсавецкай гістарыяграфіі і польскай гістарыяграфіі з уласных нацыянальных пазіцый; у расійскай гістарыяграфіі асвятляліся галоўным чынам пытанні прававога становішча касцёла і дзейнасці ордэна езуітаў; розныя аспекты тэмы атрымалі нераўнамерную ступень раскрыцця ў навуковых працах. Не даследавана арганізацыйная структура касцёла ў межах Рэспублікі Беларусь, яе асаблівасці і параўнальны аналіз. Слаба паказана спецыфіка манаскіх ордэнаў, акрамя езуіцкага, і формы дзейнасці каталіцкага духавенства.

Другі параграф першай главы "Агляд крыніц" прысвечаны аналізу апублікаваных і архіўных крыніц на рускай і польскай мовах.

Абсалютная большасць надрукаваных па тэме крыніц была выдадзена ў Расійскай імперыі на працягу другой паловы XVIII – пачатку XX ст. Гэта галоўным чынам заканадаўчыя матэрыялы, якія рэгулявалі прававое становішча касцёла ў дзяржаве. У той жа час дакументы касцёльных структур прадстаўлены даволі сціпла. Крыніцы асабістага паходжання, у першую чаргу дзённікі арцыбіскупа С.Сестранцэвіча і візітатара дамініканскіх кляштараў ўтрымліваюць дадатковыя звесткі аб становішчы касцёла. Дзённік С.Сестранцэвіча паказвае ўзаемаадносіны вышэйшага каталіцкага іерарха з царскай уладай і яго важную ролю ў справах каталіцкага касцёла. Акрамя таго ён адлюстроўвае матывацыю дзейнасці першага каталіцкага мітрапаліта ў Расіі.

Пры падрыхтоўцы дысертацыі выкарыстаны архіўныя матэрыялы Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Нацыянальных гістарычных архіваў Беларусі ў Мінску і Гродне, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі ў Гродне. Гэта галоўным чынам фонды дыяцэзіяльных структур Магілёўскай архідыяцэзіі, Мінскай і Віленскай дыяцэзій, а таксама дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў у Пецярбургу. Дакументы гэтай групы дазваляюць уявіць, як праходзіў працэс прыстасавання касцёла да палітычных рэалій Расійскай імперыі, якія ў сувязі з гэтым распрацоўваліся мерапрыемствы і як выконваліся царскія ўказы. У крыніцах адлюстраваны асноўныя формы дзейнасці духавенства, якія рэгламентаваліся расійскім заканадаўствам.

Іншую групу дакументаў, у якіх прыведзена неабходная для раскрыцця тэмы інфармацыя, складаюць матэрыялы канцылярый грамадзянскіх



губернатараў. У іх знаходзяцца шматлікія матэрыялы, якія адлюстроўваюць камунікатыўную сувязь дзяржаўных структур з дыяцэзіяльным кіраўніцтвам і ўтрымліваюць звесткі аб маёмасным становішчы касцёла, культавых пабудовах, колькасці і складзе вернікаў, наяўнасці шпіталяў і школ, дабрачыннай і іншай дзейнасці духавенства.

Такім чынам, архіўныя крыніцы дазваляюць асвятліць тэму дысертацыйнага даследавання ў розных аспектах, удакладніць і верыфікаваць фактычны матэрыял. Найбольш поўна яны адлюстроўваюць пытанні, якія тычацца арганізацыйнай структуры касцёла і дзейнасці духавенства. Большасць архіўных дакументаў выкарыстана ўпершыню. Значная ўвага ў класіфікацыі крыніц была сканцэнтравана на дакументах дэканальнай структуры касцёла, што дазволіла прасачыць мерапрыемствы і дзейнасць духавенства як на вышэйшым дыяцэзіяльным узроўні, так і ў парафіях.

Другая глава "Распрацоўка заканадаўчай базы царскіх улад у адносінах да каталіцкага касцёла" прысвечана аналізу фарміравання прававога становішча касцёла пасля далучэння зямель Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі ў 1772-1830 гг.

Кацярына II вызначыла асноўныя прынцыпы, якія рэгулявалі дзейнасць каталіцкага касцёла ў адпаведнасці з расійскім заканадаўствам. З аднаго боку, яна гарантавала вернікам свабоду веравызнання, а, з іншага, - імкнулася падпарадкаваць касцёл дзяржаўным структурам. Перш за ўсё яна вызначыла парадак зносін каталіцкага духавенства з Рымам (праз пасрэдніцтва ўрадавых структур), а таксама правяла новую дыяцэзіяльную арганізацыю касцёла, вызначыла для біскупаў грашовае ўтрыманне, захавала манаскія ордэны, у тым ліку ордэн езуітаў, пакінула касцёлу зямельную маёмасць.

Пры пераемніках Кацярыны II былі працягнуты заканадаўчыя мерапрыемствы ў адносінах да каталіцкага касцёла. Павел I правёў чарговую рэарганізацыю каталіцкіх дыяцэзій, узмацніў незалежнасць манаскіх ордэнаў ад дыяцэзіяльнай улады, стварыў асобны дэпартамент у складзе Юстыц-калегіі па кіраванню справамі касцёла. Імператар актыўна выкарыстоўваў каталіцкі фактар у міжнароднай палітыцы. У часы яго праўлення адбылася актывізацыя дзейнасці ордэна езуітаў.

Імператар Аляксандр I стварыў рымска-каталіцкую духоўную калегію, якая была вышэйшай адміністрацыйнай установай каталіцкага касцёла (некананічнай) у Расійскай імперыі да 1918 г. У 1810 г. дзейнасць касцёла была пастаўлена пад нагляд галоўнага ўпраўлення духоўных спраў замежных веравызнанняў.

У часы Аляксандра I прадпрымаліся спробы ўзвысіць кананічны статус касцёла ў дзяржаве і прыцягнуць каталіцкае духавенства да працы ў Біблейскім таварыстве. Кляштарам удалося захаваць аўтаномію ад дыяцэзіяльных біскупаў. Выгнанне ў 1820 г. ордэна езуітаў не паўплывала на становішча іншых манаскіх ордэнаў у краіне. Каталіцкі касцёл працягваў захоўваць значную зямельную ўласнасць, якая была асноўнай крыніцай яго існавання. Нягледзячы на забарону ў заканадаўчым парадку місіянерскай

дзейнасці каталіцкага духавенства сярод іншаверцаў, спробы пераводу ў каталіцкую веру не прыпыняліся.

У 1825-1830 гг. была распачата падрыхтоўка мерапрыемстваў, якая прадугледжвала абмежаванне дзейнасці і ўплываў каталіцкага духавенства. Адбылося заканадаўчае замацаванне статуса касцёла як "цярпімага" інстытута, якому аказваецца заступніцтва. У 1829 г. уступленне ў навіцыят было пастаўлена ў залежнасць ад дзяржаўнай установы – галоўнага ўпраўлення духоўных спраў у Пецярбургу. Аднак у цэлым рэальных змен у становішчы каталіцкага касцёла да пачатку паўстання 1830-1831 гг. не назіралася. Гарантаваная ўладамі свабода ў здзяйсненні рэлігійнага культа захоўвалася.

У трэцяй главе "Адміністрацыйна-тэрытарыяльная арганізацыя каталіцкага касцёла на беларускіх землях" разгледжана дыяцэзіяльная і ордэнская структура каталіцкага касцёла, значная ўвага нададзена разгляду парафіяльнай сеткі. Глава складаецца з двух параграфаў.

У першым параграфе другой главы "Дыяцэзіяльная арганізацыя" паказаны працэс фарміравання новай дыяцэзіяльнай арганізацыі касцёла на беларускіх землях.

Створаная ў 1772-1774 гг. Беларуская дыяцэзія мела неканaнічны характар. Першай кананічнай дыяцэзіяльнай (архідыяцэзіяльнай) адзінкай у Расійскай імперыі была Магілёўская архідыяцэзія, якая з самага пачатку мела мітрапаліцкі характар. Магілёўская архідыяцэзія мела ўсе неабходныя для сваёй дзейнасці структуры – курыю, кансісторыю, капітулу, дэканаты, духоўныя семінарыі, друкарню. Яе арганізацыя ў пэўным сэнсе была ўзорнай. На яе павінны былі арыентавацца аналагічныя структуры іншых дыяцэзій, якія былі створаны ў 1798 г., у прыватнасці Мінская дыяцэзія. У Віленскай дыяцэзіі захаваліся дыяцэзіяльныя структуры з часоў Рэчы Паспалітай.

Пасля 1798 г. пад кіраўніцтвам мясцовых біскупаў адбылася дэканальная рэарганізацыя касцёла ў адпаведнасці з адміністрацыйнымі межамі паветаў.

Перад 1772 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі налічвалася 259 парафій, з іх прыкляштарных – 62 (24,0 %). У 1820-х гадах колькасць парафій павялічылася да 319, у тым ліку прыкляштарных да 75 (23,5 %). Традыцыйна найбольш шчыльная сетка парафій знаходзілася ў паўночна-заходняй частцы Беларусі. На тэрыторыі Віленскай дыяцэзіі (Гродзенская губерня і частка Віленскай губерні) у 1820-х гадах яны складалі палову ад усіх парафій.

У другім параграфе трэцяй главы "Арганізацыя каталіцкіх манаскіх ордэнаў" ахарактызавана духоўная спецыфіка манаскіх фармацый, высветлена арганізацыйная структура манаскіх ордэнаў, вылучаны супольнасці, якія займаліся парафіяльнай дзейнасцю. На тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены ўсе групы манаскіх фармацый - ўласна манахі, канонікі рэгулярныя, жабрацкія ордэны, клерыкі рэгулярныя - усяго 19 мужчынскіх ордэнаў, а таксама 7 жаночых. Перад першым падзелам Рэчы Паспалітай налічвалася 180



мужчынскіх кляштараў (з улікам езуіцкіх) і 28 жаночых. У 1820-х гадах на гэтай тэрыторыі было 147 мужчынскіх кляштараў (без езуіцкіх) і 27 жаночых.

Кожны манаскі ордэн меў пэўную спецыфіку духоўнасці, на аснове якой будаваўся яго спосаб жыцця і праца. Манахаў запрашалі для выканання розных відаў дзейнасці : пастырскай, выхаваўчай, адукацыйнай, місіянерскай, даглядам за хворымі і інш.

Найбольш прадстаўнічымі былі жабрацкія ордэны (усяго 106 кляштараў каля 1772 г. і 110 – у 1830 г.). Асабліва вылучаліся дамініканцы і бернардзінцы, якія актыўна займаліся пастырствам і развівалі розныя формы рэлігійнага культа. Сярод групы клерыкаў рэгулярных (56 кляштараў каля 1772 г. і 17 – у 1830 г.) вылучаліся езуіты і піяры, якія арганізоўвалі сярэднія школы. Баніфраты і рохіты займаліся выключна дапамогай хворым. Найменш прадстаўнічымі былі манаскія ордэны ўласна манахаў (7 кляштараў каля 1772 г. і столькі ж – ў 1830 г.) і канонікаў рэгулярных (11 кляштараў каля 1772 г. і 13 – у 1830 г.). Сярод жаночых кляштараў найбольш налічвалася дамоў марыявітак (15 каля 1772 г. і 13 – у 1830 г.). Шырока былі прадстаўлены кляштары дамініканцаў (44 кляштары каля 1772 г. і 42 – ў 1830 г.), бернардзінцаў (22 кляштары каля 1772 г. і 26 – у 1830 г.), францысканцаў (21 кляштар каля 1772 г. і такая ж колькасць – у 1830 г.), кармелітаў абутых (13 кляштараў каля 1772 г. і 15 – у 1830 г.), езуітаў (36 кляштараў каля 1772 г. і 11 - перад 1820 г.).

Многія кляштары абслугоўвалі пры сваіх касцёлах парафіі. У параўнанні з 1772 г. колькасць іх павялічылася (ад 62 парафій да 82 – перад 1820 г. і да 75 – у 1820-х гадах). Найбольшую колькасць парафій мелі дамініканцы, францысканцы, бернардзінцы, кармеліты абутыя, езуіты (да 1820 г.). Прыкляштарныя парафіі дамінавалі на ўсходзе Беларусі.

У 1772-1830 гг. была праведзена рэарганізацыя межаў ордэнскіх правінцый. Правінцыяльнаму кіраўніцтву ордэнаў было забаронена падтрымліваць афіцыйныя сувязі з генераламі і генеральнымі капітуламі за мяжой. Нягледзячы на існаваўшую тэндэнцыю падпарадкаваць кляштары дыяцэзіяльнай уладзе, манаскія супольнасці здолелі захаваць самастойнасць і магчымасць жыць і займацца дзейнасцю паводле сваіх правілаў.

У чацвёртай главе "Навучальныя ўстановы каталіцкага касцёла" разгледжаны духоўныя і свецкія навучальныя ўстановы, якія знаходзіліся пад кіраўніцтвам каталіцкага духавенства. Глава складаецца з трох параграфаў

Першы параграф чацвёртай главы "Фармацыйныя дамы (навіцыяты і студыі) і духоўныя семінарыі" прысвечаны разгляду фармацыйных дамоў і навучальных устаноў, у якіх адбывалася падрыхтоўка ордэнскага і дыяцэзіяльнага духавенства.

Дзеяздольнасць ордэнскага духавенства немагчыма без навіцыятаў і студый, у якіх адбывалася падрыхтоўка (фармацыя) кандыдатаў у манаскі стан і тых, хто прыняў манаскія зарокі. Навіцыяў знаёмілі з ордэнскімі правіламі і кляштарным распарадкам, у выпадку неабходнасці ім выкладаліся прадметы са школьнага курсу.

У даследуемы перыяд навіцыяты на тэрыторыі Беларусі мелі : францысканцы, бернардзінцы, дамініканцы, кармеліты абутыя, кармеліты босыя, марыяне, піяры, езуіты, картэзіянцы, цыстэрцыянцы, бенедыкцінцы. Усяго налічвалася не менш за 20 навіцыятаў.

Пад студыяй разумелася навучальная ўстанова для манахаў, у якой у адпаведнасці са схаластычнай традыцыяй выкладаліся дзве вышэйшыя галіны ведаў – філасофія і тэалогія. Манахі з навуковымі ступенямі мелі прывілеі ў манаскім жыцці. Яны выкладалі ў студыях, рыхтаваліся да лекцый, удзельнічалі ў працы капітул, спавядалі, прамаўлялі казанні.

Найбольш развітая сістэма студый была ў дамініканцаў, акрамя іх студыі на тэрыторыі Беларусі мелі: францысканцы, бернардзінцы, кармеліты босыя, кармеліты абутыя, картэзіянцы, цыстэрцыянцы, бенедыкцінцы, канонікі рэгулярныя латэранскія, трынітарыі, марыяне. Агульная колькасць студый дасягала 31. Падрыхтоўка манахаў у місіянераў адбывалася праз сістэму ўласных семінарый. Клерыкі езуіты навучаліся ў калегіях свайго ордэна.

Сістэмай падрыхтоўкі для дыяцэзіяльнага духавенства служылі духоўныя семінарыі, якія з'яўляліся часткай дыяцэзіяльнай структуры касцёла. Духоўныя семінарыі дзейнічалі ў Магілёўскай архідыяцэзіі (у Магілёве, а таксама за межамі сённяшняй Беларусі – ў Краславе, Беластоку, Звенігародку), Мінскай дыяцэзіі (у Мінску), Віленскай дыяцэзіі (малая семінарыя ў Брэсце, а таксама дзве – ў Вільні і адна – у Ілукшце). Акрамя таго, у Вільні існавала Галоўная семінарыя, якая падпарадкоўвалася рымска-каталіцкай духоўнай калегіі.

Духоўныя навучальныя ўстановы касцёла аб'ектыўна спрыялі распаўсюджванню адукаванасці ў грамадстве і служылі пэўнай альтэрнатывай для тых, хто не мог навучацца ў віленсім універсітэце.

Другі параграф чацвёртай главы "Сярэднія навучальныя ўстановы для свецкай моладзі" прысвечаны разгляду гэтых школ у кантэксце прававога становішча касцёла і разнастайных форм дзейнасці каталіцкага духавенства.

Наяўнасць у краіне сістэмы ордэнскай адукацыі ў студыях давала магчымасць ствараць пры кляштарах публічныя школы і ўплываць на развіццё сацыяльна-культурных працэсаў у грамадстве.

Традыцыйна арганізацыяй навучальных установ для свецкай моладзі займаліся езуіты і піяры. У даследуемы перыяд яны разам мелі на тэрыторыі Беларусі 9 такіх школ. Сярод іншых манаскіх ордэнаў у галіне публічнай адукацыі вылучаліся дамініканцы, якія апекаваліся 6 школамі. Стымулам у гэтай сферы дзейнасці для дамініканцаў была пастанова ордэнскай капітулы аб унясенні выкладчыцкай дзейнасці духавенства ў публічных школах у пералік манаскіх заслуг (1809 г.).

Астатнія манаскія супольнасці значна меншае мелі дачыненне да арганізацыі сярэдніх школ. Францысканцы апекаваліся былой езуіцкай калегіяй у Пінску, канонікі рэгулярныя латэранскія ўтрымлівалі школы ў Слоніме і Відзах, а місіянеры ў Лыскаве. Кляштары іншых манаскіх ордэнаў



не выяўлялі зацікаўленасці ў арганізацыі публічных школ, таму што паводле сваіх правілаў яны не павінны былі займацца гэтым відам дзейнасці.

Школы, якія знаходзіліся ў адміністрацыі кляштараў,ігралі істотную ролю ў сістэме школьнай адукацыі і складалі амаль палову ад агульнай колькасці сярэдніх школ (47,1 % у 1790-х гадах і 42,9 % у 20-х гадах XIX ст.). Іх дзейнасць з'яўлялася сведчаннем спрыяльнай палітыкі, якую праводзіў царскі ўрад у дачыненні да касцёла.

У трэцім параграфе чацвёртай главы "Пачатковыя (парафіяльныя) школы" разгледжана спецыфіка навучальных устаноў гэтага тыпу і іх размеркаванне па дыяцэзіях.

Усяго з канца XVIII ст. і да 1830 г. на беларускіх землях дзейнічала да 306 парафіяльных школ. Абсалютная іх большасць знаходзілася пад наглядам каталіцкага духавенства – 110 школ на тэрыторыі Віленскай дыяцэзіі (89 % ад агульнай колькасці школ на тэрыторыі дыяцэзіі), 87 школ на тэрыторыі Мінскай дыяцэзіі (82 % ад агульнай колькасці школ) і 42 школы на тэрыторыі Магілёўскай архідыяцэзіі (55 % ад агульнай колькасці школ). У Віленскай і Мінскай дыяцэзіях дамінавалі школы, якімі апекавалася дыяцэзіяльнае духавенства (адпаведна 84 і 54 школы). У Магілёўскай архідыяцэзіі, дзе было больш ў працэнтных суадносінах прыкляштарных парафій, пераважалі школы пад кіраўніцтвам не дыяцэзіяльнага, а ордэнскага духавенства (27 школ).Такім чынам, пачатковая адукацыя на Беларусі ў разглядаемы перыяд знаходзілася пераважна у сферы дзейнасці касцёла.

У пятай главе "Формы дзейнасці каталіцкага духавенства" асвятляюцца найбольш значныя формы гэтай дзейнасці і паказаны яе асаблівасці. Глава складаецца з двух параграфаў.

У першым параграфе пятай главы "Здзяйсненне пастырскіх паслуг" паказаны разнастайныя формы пастырскай дзейнасці духавенства. Пастырства ў касцёле трактуецца як шырока акрэсленая місія, накіраваная на выратаванне чалавечых душ (адсюль польскамоўны тэрмін душпастырства). Асноўнымі асяродкамі пастырскай працы каталіцкага духавенства былі парафіі, місіі і капеланіі.

У парафіях арганізоўваліся місіі – пункты дадатковай абслугі вернікаў з мэтай навучання іх асновам веры. Місіі маглі праводзіцца ў далёкіх рэгіёнах краіны і свету. Капеланіі ствараліся для тых супольнасцяў вернікаў, якія па тых ці іншых прычынах не маглі атрымаць задавальнення сваіх рэлігійных патрэб у парафіях. Капеланіі існавалі ў маёнтках, жаночых кляштарах, шпіталях, войску, паўстанцкіх атрадах, турмах, сярод сасланых і ў іншых месцах.. Акрамя таго, пастырскую паслугу можна было атрымаць у кляштарных непарафіяльных касцёлах.

Пастырская праца ў парафіях прадугледжвала не толькі здзяйсненне набажэнстваў, сакрамантаў, але і асабістую апеку ксяндза над паствай – весці метрычны запіс, наведваць вернікаў па дамах, праводзіць катэхізацыю і інш.

З мэтай узмацнення рэлігійнасці, духавенства заахвочвала стварэнне рэлігійных брацтваў, якія паўставалі пры парафіяльных касцёлах і пры тых,

што не мелі парафій. Найбольш налічвалася брацтваў у бернардзінскіх і кармеліцкіх касцёлах. У бернардзінскіх касцёлах у Гродне і Слоніме – 4, у Іўе – 3, у кармеліцкіх касцёлах у Мядзелі – 5, у Глыбокім – 3. Брацтвы спрыялі распаўсюджванню пэўных рэлігійных культаў і ўкаранялі дадатковыя набажэнствы, займаліся арганізацыяй працэсій і дапамагалі паломнікам.

Многія касцёлы былі цэнтрамі рэлігійных паломніцтваў (так званыя санктуарыі). У іх знаходзіліся цудатворныя абразы і скульптуры. Вылучаліся марыйныя санктуарыі, якіх было больш за астатнія, пакуты Хрыстовай (асабліва кальварыі, якія сімвалізавалі этапы крыжовай дарогі Хрыста) і асобных святых. Агульнабеларускі характар мелі санктуарыі з каранаванымі абразамі Маці Божай – у Жыровіцах (базыльянаў, каранацыя ў 1730 г.), Бялынічах (кармелітаў абутых, каранацыя ў 1761 г.). Па ступені ўплывовасці набліжаўся да іх касцёл бернардзінцаў у Будславе. Цудатворны абраз Маці Божай з гэтага касцёла быў каранаваны ў 1998 г.

Важным бокам пастырскай працы была арганізацыя місій. Місіі праводзіліся ў вёсках і гарадах на зразумелай для вернікаў мове, у тым ліку на беларускай мове. Асабліва карыснымі місіі былі ў тых мясцовасцях, дзе не было касцёлаў. Місіянеры праводзілі катэхізацыю і здзяйснялі сакраманты, ладзілі набажэнствы. Найбольш актыўнымі місіянерамі былі езуіты і дамініканцы. Місіянеры з Беларусі высылаліся на працу ў глыб расійскіх зямель і на Каўказ.

Пастырскай працай у капеланіях займаліся, галоўным чынам, прадстаўнікі ордэнскага духавенства. Вялікая колькасць капеланій знаходзілася пры панскіх маёнтках. Найбольш дворскіх капеланій мелі дамініканцы, францысканцы і бернардзінцы. З часам некаторыя капеланіі маглі атрымліваць статус філіяльных касцёлаў.

Аналіз пастырскай працы каталіцкага духавенства паказвае, што яна не стрымлівалася царскімі ўладамі і мела багатыя формы праяўлення.

У другім параграфе пятай главы "Пазакасцёльная дзейнасць прадстаўнікоў духавенства (удзел у дабрачыннасці і грамадска-палітычным жыцці)" ахарактарызаваны асноўныя праявы гэтай дзейнасці.

Найбольш распаўсюджанай арганізаванай формай дапамогі насельніцтву былі парафіяльныя і спецыялізаваныя шпіталі. Першыя мелі характар прытулкаў для бяздомных і ўбогіх. Дыяцэзіяльныя ўлады заахвочвалі да іх арганізацыі ў кожнай парафіі. У 20-х гадах XIX ст. у Мінскай дыяцэзіі амаль палова парафій мела шпіталі, у Гродзенскай губерні на тэрыторыі Віленскай дыяцэзіі на некалькі больш за 100 парафій прыпадаў 71 шпіталь.

Арганізацыяй спецыялізаванага лячэння і дапамогі хворым займаліся кляштары баніфратаў, рохітаў, шарытак, у меншай ступені – марыявітак. Акрамя таго, каталіцкае духавенства прымала ўдзел у арганізацыі і дзейнасці таварыстваў дабрачыннасці, першым з якіх і ўзорным для астатніх было заснаванае ў 1807 г. віленскае таварыства.



Некаторыя прадстаўнікі каталіцкага духавенства ўваходзілі ў склад масонскіх арганізацый. Найбольш актыўныя асобы прымалі ўдзел у грамадска-палітычнай дзейнасці, накіраванай супраць расійскіх улад. Яны дапамагалі паўстанцам Т.Касцюшкі ў 1794 г., адмаўляліся ад прыняцця вернападданіцкай прысягі, выказвалі публічнае асуджэнне мерапрыемствам царскіх улад. У спісах канспіратыўнай Віленскай асацыяцыі, якая дзейнічала ў 1796 – 1797 гг., было тры духоўныя асобы. Мінскі біскуп Я.Дэдэрка ў 1812 г. прыняў прысягу на вернасць Напалеону і абвясціў Мінскую канфедэрацыю. У казаннях і зваротах, якія гучалі ў касцёлах, выкарыстоўваліся патрыятычныя матывы і сімволіка (пад час паўстання 1794 г., вайны 1812 г., жалобных набажэнстваў ў гонар Т.Касцюшкі ў 1817 г.).

Гэта былі выпадкі праяўлення асабістай ініцыятывы прадстаўнікоў духавенства. У цэлым каталіцкі касцёл, епіскапат, парафіяльнае і ордэнскае духавенства, выказалі лаяльнае стаўленне да расійскіх улад.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Да 1772 г. дзейнасць нешматлікіх каталіцкіх абшчын у Расійскай імперыі рэгулявалася рэгламентам 1769 г. Пасля далучэння зямель Рэчы Паспалітай расійскія ўлады самастойна, без кансультацый з духавенствам, правялі распрацоўку заканадаўчай базы ў дачыненні да касцёла. Гэта мерапрыемства павінна было ўключыць касцёл у прававое поле расійскай дзяржавы ў адпаведнасці з дзеючай практыкай падпарадкавання царквы дзяржаўнаму апарату. Нягледзячы на цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія ставілі касцёл ў залежнасць ад дзяржавы і значна абмяжоўвалі яго сувязь з папам, царскаму ўраду не ўдалося дасягнуць у даследуемы перыяд пастаўленых мэтаў у поўным аб'ёме. Па-першае, мясцовы касцёл не быў кананічна адарваны ад Рыма, найбольш важныя пытанні, якія тычыліся яго дыяцэзіяльнай арганізацыі (заснаванне дыяцэзій і прызначэнне дыяцэзіяльных біскупаў) патрабавалі папскага зацвярджэння. Спецыфіка ўнутранага і знешняга палітычнага становішча Расійскай імперыі спрыяла падтрымцы дыпламатычных сувязей Пецярбурга з Рымам. Па-другое, каталіцкае духавенства працягвала захоўваць свае ўплывы ў грамадстве. Важную ролю ў захаванні стабільнага становішча касцёла адыграла асоба мітрапаліта С.Сестранцэвіча [2, с.13 – 19; 4, с.39 – 46; 8, с. 187 – 200; 15, с.154 – 155].

2. Залежнае ад дзяржавы становішча касцёла адлюстравалася ў яго новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры. Усталяваны над касцёлам кантроль прадугледжваў вызначэнне ўладамі яго дыяцэзіяльнай арганізацыі, якая праводзілася без узгаднення з прадстаўнікамі духавенства. Дыяцэзіяльныя адзінкі ствараліся ў адпаведнасці з губернскімі і павятовымі межамі. На тэрыторыі Беларусі межы дыяцэзій у цэлым адпавядалі тром

падзелам Рэчы Паспалітай. У выніку тут адбылося значнае ўзмацненне дыяцэзіяльных структур, павялічылася колькасць парафій і дэканатаў. Біскупы атрымалі магчымасць часцей наведваць касцёлы, а дэканы – узмацніць кантроль над парафіяльным духавенствам. Аб'ектыўна гэта спрыяла павышэнню рэлігійнасці і ўзмацненню пазіцый касцёла [2, с.13 – 19; 3, с.97 – 116; 9, с.219 – 224; 12, с.557 – 558].

3. Прававое становішча каталіцкіх манаскіх ордэнаў на беларускіх землях вызначалася расійскім заканадаўствам. Фарміраванне юрыдычнага статусу каталіцкага манаства адбывалася пад уплывам супрацьстаяння мітрапаліта С.Сестранцэвіча, які выступаў за поўнае падпарадкаванне кляштараў сваёй уладзе, з езуітамі, якія дамагаліся незалежнасці ад яго ўлады. У выніку манаскія ордэны захавалі сістэму ордэнскіх правінцый на чале з правінцыяламі і атрымалі аўтаномію ад дыяцэзіяльных біскупаў. Ордэнскаму духавенству было забаронена падтрымліваць афіцыйныя сувязі з замежным кіраўніцтвам і займацца пераводам у каталіцтва вернікаў іншых канфесій. Да 1829 г. дзяржава не ўмешвалася ва ўнутрыманаскае жыццё. Агульная колькасць кляштараў, без уліку езуіцкіх асяродкаў, амаль не змянілася (144 каля 1772 г. і 147 у 1820-х гадах). У іх рэлігійнай дзейнасці пераважала пастырства. На ўсходзе Беларусі прыкляштарныя парафіі дамінавалі. Існаванне і дзейнасць каталіцкіх кляштараў сведчыць аб адсутнасці памкненняў з боку ўлад гвалтоўна разбураць кананічную арганізацыйную структуру касцёла ў Расійскай імперыі. Пытанне захавання і выгнання езуітаў мае выразна акрэсленую палітычную афарбоўку і таму яго нельга разглядаць у сувязі са становішчам іншых манаскіх ордэнаў [2, с.13 –19; 3, с. 97 – 116; 11, с.557].

4. На працягу даследуемага перыяду каталіцкі касцёл захаваў усе інстытуты, у якіх здзяйснялася падрыхтоўка духавенства – духоўныя семінарыі, навіцыяты і манаскія студыі. Іх арганізацыя была ўнутранай справай касцёла. Узровень падрыхтоўкі духавенства даваў магчымасць выкладаць у публічных сярэдніх школах. Да 1825 г. дзяржава заахвочвала касцёл да гэтай дзейнасці. Аднак праца ў сферы публічнай адукацыі супярэчыла манаскім правілам. Толькі ў езуітаў і піяраў, а з 1809 г. у дамініканцаў, яна ўваходзіла ў лік манаскіх заслуг. Школы, якімі апекавалася манаства, складалі больш за 40% ад агульнай колькасці сярэдніх школ. Акрамя сярэдніх школ, пад апекай каталіцкага духавенства, пераважна дыяцэзіяльнага, знаходзілася каля 90% усіх пачатковых школ. Дамінацыя каталіцкага духавенства ў арганізацыі публічных школ тлумачыцца як традыцыяй, так і аб'ектыўнымі абставінамі сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель [1, с.180 – 187; 2, с.13 – 19; 5, с. 185 – 196].

5. Касцёл захаваў свабоду ў арганізацыі рэлігійнага жыцця. Царскія ўлады прытрымліваліся абавязацельстваў, якія тычыліся свабоды адпраўлення



каталіцкага культу. Яны не парушалі ў гэтай галіне грамадзянскіх правоў вернікаў, галоўным выразнікам якіх была шляхта. На беларускіх землях працягвалася рознабаковая пастырская праца каталіцкага духавенства ў парафіях, капеланіях, місіях. Дыяцэзіяльнае і ордэнскае духавенства здзяйсняла разнастайныя набажэнствы, абрады і сакраманты паводле мясцовай традыцыі і польскага сінадальнага права XVIII ст. [2, с.13 – 19; 8, с.187 – 200].

6. Каталіцкае духавенства імкнулася да сацыяльна-актыўнай ролі ў грамадстве і ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, аднак у палітычных умовах расійскай дзяржавы гэта сфера дзейнасці для яго значна звузілася. З гэтай прычыны асаблівае значэнне для духавенства набыла дабрачынная дзейнасць, якая, з аднаго боку, найбольш адпавядала хрысціянскім дабрадзейнасцям, а, з другога, не толькі не забаранялася, але нават заахвочвалася расійскім заканадаўствам. Каталіцкае духавенства беларускіх зямель фарміравалася пераважна з ліку мясцовага насельніцтва і таму адлюстроўвала яго настроі. Прадстаўнікі духавенства ўваходзілі ў склад масонскіх арганізацый, некаторыя прымалі ўдзел у апазіцыйных ураду акцыях. У розных формах яны выказвалі акты асабістага непадпарадкавання расійскім уладам, удзельнічалі ў вызваленчым руху. Аднак апазіцыйная дзейнасць духоўных асоб не адлюстроўвала афіцыйную пазіцыю каталіцкага касцёла, які ў цэлым заставаўся лаяльным да царскіх улад [2, с.13 – 19; 6, с.633 – 642; 7, с.259 – 263; 8, с. 187 – 200].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ

### Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках


1. Ганчарук І. Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі: канец XIV-XX ст. // Беларусіка=Albaruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыян.. міжрэлігійн. і міжкультур. узаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч.1. / Рэд. Ул. Конан і інш. – Мн.: ННАЦ імя Ф.Скарыны, 1997. – С. 180-187.
2. Ганчарук І. Структура, становішча і дзейнасць рымска-каталіцкай царквы на тэрыторыі Гродзенскага павета ў 1795-1830 гадах // Весці Нацыянальнай АН Беларусі. Сер. гум. навук. – 1999. – №4. – С. 13-19.
3. Ганчарук І. Становішча і арганізацыйная структура рымска-каталіцкага касцёла на беларускіх землях у складзе Расейскай імперыі // Гістарычны альманах. – Гародня, 2002. – Т. 6. – С. 97-116.
4. Ганчарук І. Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай царквы (1772-1830 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. – №1. – С. 39-46.

5. Ганчарук І. Каталіцкія манаскія ордэны на Беларусі ў 1770-х – 1820-х гг. (спецыфіка духоўнасці і фармацыйныя дамы) // Гістарычны альманах.- Гародня, 2003. – Т.9. – С. 185-196.


**Матэрыялы канферэнцый**


6. Ганчарук І. Да пытання аб ролі каталіцкай царквы ў вызваленчым руху Беларусі ў Х IX ст. // Наш радавод. – Гродна, 1992. – Кн.4, ч.3.- С. 633-642.
7. Ганчарук І.Г. Касцёл і гістарычная свядомасць каталіцкага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII-першай трэці XIX ст. (спосабы ўплыву) // Наш радавод. – Гродна, 1996. – Кн. 7. – С. 259-263.
8. Ганчарук И. Римско-католическая церковь и религиозная жизнь в Беларуси в конце XVIII-первой половине XIX вв. (па материалам белорусских архивов) // Proceedings of the commission internationale d'histoire ecclesiastiqe comparee, Lublin 1996. Part 4. Churches – States – Nations. In the enlight enment and in the nineteenth century. – Lublin: In-t Europy Środkowo – Wschodniej, 2000. – S.187-200.
9. Ганчарук І.Г. Фарміраванне парафіяльнай сеткі Слонімскага дэканата ў XVII-XX стагоддзях // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: Матэрыялы гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 750-годдзю горада Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея ім.І.І.Стаброўскага. / Складальнікі Д.С.Аляшкевіч, І.П.Крэнь; Пад рэд. І.П.Крэня. – Слонім друк., 2002. – С. 219-224.


**Артыкулы ў энцыклапедычных выданнях**


10. Ганчарук І. Кардынал // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1997. – Т.4. – С. 114.
11. Ганчарук І. Правінцыя ордэна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1999. – Т. 5. – С. 557.
12. Ганчарук І. Правінцыя царкоўная // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1999. – Т. 5. – С. 557-558.
13. Ганчарук І. Пробашч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.- Мн., 1999. – Т. 5. – С. 573-574.
14. Ганчарук І. Прымас // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1999. – Т. 5. – С. 583.
15. Ганчарук І. Рымска-каталіцкая царква на Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 2001. – Т.6. Кн.1.- С. 154-155.




## РЭЗЮМЕ


ГАНЧАРУК ІГАР ГЕНАДЗЬЕВІЧ

Каталіцкі касцёл на Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. 1772-1830 гг.

**Ключавыя словы:** каталіцкі касцёл, адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура каталіцкага касцёла, дыяцэзіі, манаскія ордэны, кляштары, парафіі, дзейнасць духавенства, заканадаўчая база, палітыка расійскіх улад, навучальныя ўстановы, фармацыйныя дамы.

**Аб'ект даследавання** – грамадскае жыццё беларускіх земель ў 1772 1830 гг. **Прадмет** – каталіцкі касцёл, як адзін з інстытутаў грамадскага жыцця. **Мэта дысертацыі** – аналіз становішча каталіцкага касцёла на тэрыторыі Беларусі, выяўленне яго спецыфікі і ролі ў грамадстве.

**Метадалагічную аснову** дысертацыі складаюць дыялектычныя прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, якія спалучаюцца з агульнанавуковымі і гістарычнымі метадамі даследавання. **Навізна** заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі даследуецца прававое становішча касцёла ў часы Расійскай імперыі, яго дыяцэзіяльная і ордэнская арганізацыя, у тым ліку фармацыйныя дамы (навіцыяты і студыі) і духоўныя семінарыі. У працы паказаны разнастайныя формы пастырскай і пазакасцёльнай (адукацыйна-выхаваўчай, дабрачыннай і грамадска-палітычнай) дзейнасці духавенства. У навуковы ўжытак уводзяцца статыстычныя апрацаванні, якія тычацца колькасці парафій, кляштараў, навіцыятаў і студый. Матэрыялы дысертацыі дазваляюць шырэй асвятліць гістарычны працэс на беларускіх землях з 1772 г. да паўстання 1830 – 1831 гг. Многія праблемы, якія падымаюцца ў працы, пераклікаюцца з сучаснасцю.

**Вынікі даследавання** могуць быць выкарыстаны для далейшага вывучэння касцёла, падрыхтоўкі абагульняючых прац і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, для распрацоўкі агульных і спецыяльных курсаў у вучэбным працэсе вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, у навуковай папулярызацыі гістарычных ведаў.

## РЕЗЮМЕ

ГОНЧАРУК ИГОРЬ ГЕННАДЬЕВИЧ

Католический костёл в Беларуси в составе Российской империи. 1772-1830 гг.

**Ключевые слова:** католический костёл, административно-территориальная структура католического костёла, диоцезии, монашеские ордены, монастыри, парафии, деятельность духовенства, законодательная база, политика российских властей, учебные заведения, формационные дома.

**Объект исследования** – общественная жизнь белорусских земель в составе Российской империи в 1772 – 1830 гг. **Предмет** – католический костёл, как составной элемент этого процесса. **Цель диссертации** – анализ положения католического костёла на территории Беларуси, выявление его специфики и роли в обществе.

**Методологической основой** диссертации являются диалектические принципы историзма и объективности, которые сочетаются с общенаучными и историческими методами исследования. **Новизна** заключается в том, что впервые в отечественной историографии исследуется правовое положение костёла в период Российской империи, его диоцезиальная и орденская организация, в том числе формационные дома (новициаты и студии) и духовные семинарии. В работе показаны разнообразные формы пастырской и внекостёльной (учебно-воспитательной, благотворительной и общественно-политической) деятельности духовенства. В научный оборот вводятся статистические обработки, которые показывают количество парафий, монастырей, новициатов и студий.Материалы диссертации позволяют шире осветить исторический процесс на белорусских землях с 1772 г. до восстания 1830-1831 гг. Многие проблемы, которые подымаются в работе, перекликаются с современностью.

**Результаты исследования** могут быть использованы для дальнейшего изучения костёла, подготовки обобщающих работ и учебно-методических пособий, для разработки общих и специальных курсов в учебном процессе высших учебных заведений республики, в научной популяризации исторических знаний.



## SUMMARY

HANCHARUK IHAR

Catholic Church in Belarus within the boundaries of the Russian Empire in 1772-1830

**Key words:** Catholic Church, administrative-territorial structure of Catholic church, dioceses, monks orders, monasteries, parishes, clrergy activities, legislation, policy of Russian authorities, educational establishments, formation houses.

**The object of research** is the change in public life on Belarusian lands after they became a part of the Russian Empire in 1772-1830.

**The subject of investigation** is Catholic church as a compound component of this process.

**The aim of the thesis** is to analyze the state of Catholic church on the territory of Belarus, namely its legal status, organizational structure and clergy activities.

**Methodology and methods** of the theme research can be used for its further working out concerning the period of the XIX-th-the beginning of the XX-th centuries.

**The thesis is the first special research** in the historiography of our country, in which the forming of legislation concerning Catholic church, administrative-territorial organization of diocese and order structures are analyzed, formation houses and spiritual seminaries are dealt with. Statistic data which concern the number of parishes, monasteries, novices and studios within the boundaries of modern Belarus is introduced into scientific usage . Besides this the status of public schools which were under Catholic church protection is considered. Various forms of pastoral and cathedral activities of clergy are shown.

The materials of thesis allow to throw more light upon the historic process on the Belarusian lands as a part of the Russian Empire in 1772 till the 1830-1831 uprising. A lot of issues taken up in the work have something in common with the ones of modern times: it is the renewal of the Minsk-Mahiliow diocese in 1991, the conferment of cardinal status to Minsk-Mahiliow archbishof Kazimir Sviontak in 1994, the forming of administrative struktures of church, the resumpition of pastoral work with believers and participation in the social-cultural life of the country.

**The results of the thesis** can be used for the writing of generalizing works, for compiling manuals on History of Belarus, for encyclopedic editions, for general and special courses design at the higher educational establishments of the Republik, for historic knowledge popularization in mass media.



Подписано в печать 05.01.2005. Формат 60 x 84/16.
Бумага офсетная №1. Печать RIS0. Гарнитура Таймс.
Усл. печ. л. 1,22. Тираж 80 экз. Заказ 001.

Отпечатано на технике издательского центра Учреждения образования
«Гродненский государственный университет имени Янки Купалы».
ЛП № 02330/0056882 от 30.04.2004. Ул. Пушкина, 39, 230012, Гродно.

Подписано в печать 05.01.2005. Формат 60 х 84/16.
Бумага офсетная №1. Печать RISO. Гарнитура Таймс.
Усл. печ. л. 1,22. Тираж 80 экз. Заказ 001.

Отпечатано на технике издательского центра Учреждения образования
«Гродненский государственный университет имени Янки Купалы».
ЛП № 02330/0056882 от 30.04.2004. Ул. Пушкина, 39, 230012, Гродно.